ЛЮБАНШЧЫНА ПАРТЫЗАНСКАЯ

# Напярэдадні вызвалення: люты

**У канцы студзеня-пачатку лютага 1944 г. у выніку паспяхова праведзенай Мазырска-Калінкавіцкай наступальнай аперацыі Чырвонай Арміі фронт наблізіўся да межаў Любанска-Акцябрскай партызанскай зоны. На тэрыторыі нашага раёна размясціліся тылы варожай арміі. У мэтах ліквідацыі партызанскіх фарміраванняў і захопу мірнага насельніцтва для вывазу на работы ў Германію нямецка-фашысцкае камандаванне праводзіць шэраг карных аперацый.**



**Іван ГРЫШКОЎ, камісар партызанскага атрада ім. Лазо брыгады №64.**



**Мікалай ПЯКЕЛЬНІК, радавы п/а ім. Громава бр. №64, загінуў 8.02.1944.**



**Іван МІЦУРА, начальнік штаба п/а ім. Сільніцкага бр. №25.**



**Сцяпан МІХНЕВІЧ, разведчык п/а ім. Гарбачова бр. №25.**



**Сцяпан ЯРОШАЎ, камісар п/а ім. Кутузава бр. №25.**



**Васіль ЧАГЛАКОЎ, начальнік штаба п/а ім. Лазо бр. №64.**



**Васіль ШАМЯКОЎ, камандзір п/а «Камсамолец» бр. №25.**



**Пётр ПАПОЎ, начальнік штаба п/а ім. Даватара бр. №64.**

Яшчэ ў сярэдзіне студзеня нямецкія войскі з боку Старых Дарог, Слуцка, Любані і Жыткавіч атакавалі партызанскія брыгады, якія дыслацыраваліся на тэрыторыі Любанскага раёна. Аляксандр Далідовіч, камандзір партызанскай брыгады №25 імя П.К. Панамарэнкі, у сваім дзённіку піша, што народныя мсціўцы штодзённа вялі баі з праціўнікам.

У лютым супраць партызан былі накіраваны новыя сілы – 102-я пяхотная дывізія, 35-я дывізія СС, асобныя ахоўныя і паліцэйскія батальёны і іншыя воінскія часці агульнай колькасцю да 35 тысяч салдат і афіцэраў. Пяхоту падтрымлівалі авіяцыя, танкі і артылерыя. Першае наступленне карнікаў пачалося 31 студзеня супраць атрадаў партызанскай брыгады №25 імя П.К. Панамарэнкі, штаб якой у гэты час знаходзіўся ў в. Камуна.

У фондах Любанскага музея народнай славы захоўваюцца архівы брыгады. Сярод дакументаў загады №60 і №61 ад 30 студзеня і 1 лютага 1944 г., якія падрабязна апавядаюць пра баі гэтых дзён.

«Праціўнік сіламі трох батальёнаў з чатырма 76-міліметровымі і чатырма 45-мм гарматамі пры падтрымцы 13 танкаў і 8 бронемашын 31.01.44 у 5.00 сканцэнтраваўся каля в. Шыпілавічы, адкуль у 8.00 пачаў наступленне на в. Новыя Юрковічы. Вартавая застава атрада імя Я. Гарбачова, якая размяшчалася на высотах паміж Шыпілавічамі і Н. Юрковічамі, сваім агнём вымусіла праціўніка прыняць баявы парадак».

Асноўныя сілы атрада занялі абарону на высотах каля Н. Юрковічаў, а калі вораг наблізіўся, па ім з дзотаў і акопаў адкрылі ружэйна-кулямётны агонь. Наступленне карнікаў было затрымана. Праз некаторы час немцы з боку Шыпілавічаў пачалі артылерыйскую падрыхтоўку, варожыя танкі падышлі да дзотаў і адкрылі агонь з пушак і буйнакаліберных кулямётаў. Атрад імя Я. Гарбачова вымушаны быў адысці і заняць абарону на ўскраіне Ст. Юрковіч, а немцы ўвайшлі ў Н. Юрковічы, спалілі частку вёскі і пачалі наступленне. Бой за Ст. Юрковічы працягваўся больш за 4 гадзіны, але захапіць вёску нямецка-фашысцкім акупантам не ўдалося, партызаны прымусілі іх адступіць.

У ноч на 1 лютага атрадам брыгады №25 імя П.К. Панамарэнкі быў аддадзены загад №61, які абавязваў камандзіраў для адбіцця націску праціўніка і яго затрымання прымяняць усе сродкі і метады партызанскай і вайсковай тактыкі барацьбы, устройваць завалы, мініраванне завалаў і дарог, разбураць масты, перакопваць дарогі рвамі і варонкамі.

1 лютага баі ўзнавіліся. У 8 гадзін раніцы нямецка-фашысцкія войскі пачалі наступленне з артылерыйскага абстрэлу лесу і працягвалі яго да поўдня. Праз некаторы час у накірунку в. Сялец рушыла пяхота. Ішлі баі таксама каля вёсак Турок і Аляксандраўка.

У гэты дзень фронт барацьбы паміж народнымі мсціўцамі і ворагам праходзіў па лініі Сосны-Кузьмічы-Нежын-Калінаўка; у тыле карнікаў (у раёне вёсак Турок, Барок, Фёдараўка, Слабодка) дзейнічаў партызанскі атрад «Камсамолец».

Партызанам было неабходна ўзбраенне, і дапамога прыйшла з-за лініі фронту: у ноч на 6 лютага самалёты скінулі значную колькасць баявых грузаў.

Міхаіл Жалтоў, партызан атрада імя Я. Гарбачова, у сваім дзённіку піша: «1/ІІ – 17/ІІ.44 г. Пасля некалькіх баёў з танкамі і бронемашынамі немцаў нам давялося эвакуіравацца ў лес у зялёныя лагеры. Вораг заняў бліжэйшыя вёскі. Іх жыхары знаходзяцца разам з намі. Немец шэраг вёсак спаліў, шмат каго з мірнага насельніцтва забіў. Адчуваецца, што Чырвоная Армія падышла зусім блізка – да яе 45–50 км. Штодзённа даносяцца гукі кананады. Партызаны выходзяць на дарогі, абстрэльваюць асобныя групы немцаў і іх машыны, мініруюць дарогі».

**У ходзе карнай аперацыі супраць атрадаў партызанскай брыгады №25 імя П.К. Панамарэнкі часткова спалена в. Н. Юрковічы, поўнасцю згарэлі в. Фёдараўка (загінулі 15 жыхароў) і в. Прыклінец (загінулі 4 жыхары).**

12 лютага пачалося наступленне карнікаў супраць атрадаў партызанскіх брыгад №64 імя В.П. Чкалава і №100 імя С.М. Кірава. Штаб брыгады №64 у гэты час размяшчаўся ў в. Пярэспа, а ў в. Пласток стаяў партызанскі атрад імя С. Лазо, які і прыняў першы ўдар карнікаў на сябе.

Іван Салавей, урач атрада імя С. Лазо, успамінае, што ў ноч на 12 лютага ў Палічным з'явіліся немцы і паліцаі. Нікога не чапалі, прайшлі праз вёску і накіраваліся далей у бок Пластка. У Палічным засталося каля 10 паліцаяў, якія сталі грабіць мірных жыхароў. Людзі добра іх напаілі, а самі, сабраўшы свой скарб, пакінулі вёску і схаваліся ў лесе.

Весткі распаўсюджваліся хутка. Пра наступленне карнікаў стала вядома і ў Пластку, і вяскоўцы вырашылі пакінуць свае хаты. Але за населеным пунктам іх чакалі карнікі. Некаторым жыхарам вёскі ўдалося выратавацца, але многія загінулі пад агнём ворага на балоце.

Атрады партызанскай брыгады №64 імя В.П. Чкалава на працягу некалькіх дзён вялі абарончыя баі, а затым вымушаны былі адступіць у глыб партызанскай зоны.

Для мірных жыхароў наступілі змрочныя дні. Сведка тых падзей В.М. Сяховіч успамінае: «У лютым 1944 г. на вёску [Трайчаны] наляцелі карнікі. Мы схаваліся ў зямлянцы ў лесе каля вёскі. Фашысты схапілі тады многіх вяскоўцаў, большасць з іх спалілі жывымі ў калгасным кароўніку. Згарэла там і мая маці. У нас тады жылі яўрэі – бежанцы з Глуска, Бабруйска, Старых Дарог – усіх іх было дзесяць чалавек. Каб не трапіць у рукі азвярэлых ворагаў, яны ўзарвалі сябе ў хаце гранатай. 15 лютага мы схаваліся ў лесе паміж вёскамі Трубяціна і Плюсна. Побач па дарозе ездзілі і хадзілі гітлераўцы, мы з бацькам і сястрой Кацяй ляжалі, баючыся паварушыцца. Цэлы тыдзень не адважваліся выйсці з лесу. Не маглі развесці агонь, нельга было нават заснуць, а стаялі маразы…»

Не ў лепшым становішчы апынуліся і партызаны брыгады №100 імя С.М. Кірава. Карныя атрады ўварваліся ў зону дыслакацыі брыгады (штаб размяшчаўся ў в. Асавец). Сілы былі няроўнымі, і партызаны адступілі.

Хутка перарвалася і радыёсувязь са штабам партызанскага злучэння Мінскай вобласці.

**Нямецка-фашысцкае камандаванне, няглядзячы на страты, вырашыла скончыць з партызанскімі атрадамі ў сваіх армейскіх тылах і накіравала супраць іх дадатковыя воінскія падраздзяленні.**

Беларускі штаб партызанскага руху прыняў рашэнне: каб адцягнуць сілы праціўніка з Любанска-Акцябрскай партызанскай зоны, неабходна распачаць актыўныя баявыя дзеянні народных мсціўцаў у іншых раёнах Беларусі.

Блакіраваным партызанскім атрадам Любаншчыны і суседніх раёнаў савецкія самалёты пастаянна дастаўлялі боепрыпасы, да іх былі накіраваны 5 радыстаў з рацыямі. Франтавая авіяцыя некалькі разоў бамбіла варожыя часці ў раёне Слуцка, Любані, Асіповіч і іншых месцах.

У выніку карных аперацый у пачатку лютага 1944 г. вораг авалодаў дарогамі Любань-Пагост, Любань-Шыпілавічы-Сялец-калгас імя БВА-Калінаўка-Гарадзяцічы. Нямецка-фашысцкае камандаванне спрабавала аднавіць іх для забеспячэння работы сваіх тылоў. Быў распачаты рамонт і чыгункі Старушка-Пасталы-саўгас «10 год БССР». Але лясная гвардыя Любаншчыны, каб парушыць планы ворага, працягвала «рэйкавую вайну». Толькі партызанскія атрады брыгады №25 імя П.К. Панамарэнкі ў гэты час знішчылі тры эшалоны з жывой сілай і тэхнікай праціўніка. На дарозе Любань-калгас імя БВА-Калінаўка на мінах падарвалі 10 аўтамашын з боепрыпасамі, прадуктамі харчавання і жывой сілай. На гэтай жа дарозе з засад знішчылі 6 падвод, забілі 36 і паранілі 22 нямецкія салдаты і афіцэры.

**Наталія СІНЯК, дырэктар Любанскага музея народнай славы.**